Будущие учителя доказывают целесообразность выбранного методического приёма, и обыгрывают свой фрагмент урока.

В результате проведённой работы студенты отмечают, что схема может помочь ученикам в процессе решения задач (в том числе и на пропорциональную зависимость величин), хотя в начальной школе чаще всего используется методический прием заполнения таблицы по условию задачи.

Поиск нового способа решения задачи - процесс увлекательный. После нескольких практических занятий студенты отметили, что решать задачи стало легче. Не вызывает больших трудностей построение схемы, установление взаимосвязей между величинами, представленными в задаче. Кроме этого, будущими учителями чаще стали предлагаться для организации работы над задачей такие методические приёмы как: выбор схемы, соответствующей задаче; дополнение схемы по условию задачи; построение схемы, соответствующей условию задачи и т. п.

После проведенной работы студенты очной и заочной форм обучения использовали данные методические приёмы на практике. По отзывам учителей-практиков дети изменили своё отношение к работе над задачами и стали чаще искать и находить различные способы решения задач.

**Список литературы**

1. Истомина, Н. Б. Методика обучения математике в начальной школе. Развивающее обучение. Сборник методических задач / Н. Б. Истомина, Ю. С. Заяц. – Смоленск : Ассоциация XXI век, 2016. – 200 с.

---

# КРАЯЗНАЎЧЫ МАТЭРЫЯЛ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ЯК СРОДАК ВЫХАВАННЯ БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ

*Рабцава Л.У.,*
*Аршанскі каледж УА «Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава», г. Орша*

Анатацыя. Адным з магчымых варыянтаў пабудовы цікавага і змястоўна насычанага ўрока можа быць выкарыстанне на ім мастацкага краязнаўства. Апошняе ўяўляе сабой працэс вывучэння, засваення, захавання, развіцця і распаўсюджвання навучэнцамі каштоўнасцей мастацкай культуры роднага краю, а таксама выхаванню будучых настаўнікаў.

*Ключавыя словы: мастацкае краязнаўства, мастацкая культура, аршанскія паэты і пісьменнікі.*

Беларуская літаратура з'яўляецца скарбніцай філасофскай і маральна-эстэтычнай думкі. Яна прадстаўлена імёнамі такіх знакамітых паэтаў і пісьменнікаў, як Я.Колас, Я.Купала, М.Багдановіч, К.Чорны, М.Танк, І.Мележ, В.Быкаў, У.Караткевіч, А.Адамовіч і многіх іншых. Мастацкае слова гэтых

аўтараў, якое абапіраецца на глыбінную народную філасофію, дало тлумачэнне сутнасці, сэнсу, асаблівасцей нацыянальнага жыцця.

Адным з магчымых варыянтаў пабудовы цікавага і змястоўна насычанага ўрока можа быць выкарыстанне на ім мастацкага краязнаўства. Апошняе ўяўляе сабой працэс вывучэння, засваення, захавання, развіцця і распаўсюджвання навучэнцамі каштоўнасцей мастацкай культуры роднага краю [1, 3].

У працэсе мастацкага краязнаўства навучэнцы знаёмяцца з творчасцю і біяграфіяй пісьменнікаў-землякоў, а таксама выяўляюць памятныя мясціны, звязаныя з гісторыяй стварэння твораў мастацкай літаратуры. Гэта дазваляе ім усвядоміць сувязь літаратуры з жыццём, убачыць тое асяроддзе, тыя факты і з'явы, якія паслужылі матэрыялам для творчасці паэта і пісьменніка, пранікнуць у яго творчую лабараторыю, вывучыць яго метад, ідэалы, прасачыць сувязь яго творчасці з вызначанымі сацыяльна-гістарычнымі ўмовамі.

Часам такі месны матэрыял невялікі па аб'ёму і выступае толькі ў якасці дадатка да вызначанай тэмы, але яго неабходна выкарыстоўваць. Так, напрыклад, пры вывучэнні тэмы «Гістарычнае мінулае ў творчасці сучасных беларускіх пісьменнікаў» мэтазгодна звярнуцца да творчасці пісьменніка Аршаншчыны У.Караткевіча, якога найперш цікавіў лёс народа, гістарычныя старонкі барацьбы беларусаў за свабоду, за маральнае, а не толькі фізічнае разняволенне. У ранніх творах ён даверыўся легендам і паданням, летуценнасці («Лятучы Галандзец»), прыгажосці прыроды, празрыстаму небу і вясновай паводцы («Блакіт і золата дня»), адкрыў паэзію жыцця, кахання, дзяцінства («У шалашы», «Як звяргаюцца ідалы»). Яго першыя героі – і паэт Лявон Касачэўскі, і двухгадовая Алёнка – глядзяць на свет, як і сам аўтар, шырока адкрытымі, даверлівымі вачамі.

Так як у пачатку свайго творчага шляху Караткевіч-празаік пачынае адкрываць чытачу Беларусь, яе даўняе, сівое мінулае, то у творах пра мінулае Караткевіча найперш цікавіць лёс народа, гістарычныя старонкі барацьбы беларусаў за свабоду, за маральнае, а не толькі фізічнае разняволенне. У іх ён заклікае сваёй нас палюбіць, захапіцца Радзімай, яе сынамі і дочкамі, яе слаўнай гісторыяй. Розныя тэмы раскрыты ў гістарычных творах аўтара: у цэнтры рамана «Нельга забыць» падзеі паўстання 1863 года, культ свабоды ў цэнтры аповесцей «Ладдзя Роспачы», «Дзікае паляванне караля Стаха», рамана «Чорны замак Альшанскі», п'ес «Кастусь Каліноўскі», «Званы Віцебска», «Маці ўрагана» і многіх іншых твораў.

Творы У. Караткевіча вучаць будучых настаўнікаў любіць жыццё, шанаваць каханне, не толькі браць, але і аддаваць, верыць і перамагаць. Яны – рамантычна-акрыленыя, яркія, як мары і думкі самога пісьменніка. У іх пульсуе жывая, крынічная, а не замутнёная, скалечаная, усечаная гісторыя.

Тэму «Адлюстраванне подзвігу народа ў Вялікай Айчыннай вайне» можна пачаць са знаёмства з творчасцю аршанскіх паэтаў і пісьменнікаў, якія смела і рашуча выступалі супраць фашысцкіх захопнікаў. Гэта – Ю.Багушэвіч, А.Стаховіч, У.Корбан, М. Садковіч, Я.Васілёнак, А.Міронаў, І.Сіпакоў.

Аповесці, апавяданні, вершы, байкі, гумарэсткі ваеннай тэматыкі актуальны і сёння, бо пісаліся яны не толькі для свайго часу, але і для будучыні. Пісьменнікі і паэты Аршаншчыны паспяхова распрацавалі ваенную тэму, пранікаючы ў яе глыбінныя пласты, па-свойму асэнсоўваючы і звязваючы з сучаснасцю падзеі тых даўніх гадоў. Гэта сведчыць пра тое, што подзвіг народа жыве ў памяці людской і шчодра сілкуе нашу літаратуру.

Урокі вывучэння сучаснай беларускай паэзіі зноў трэба пачаць з творчасці Уладзіміра Караткевіча, бо гэта арыгінальны і непаўторны паэт. Ён пачынаўся з паэзіі – праўдзівай, шчырай, смелай, прасякнутай невычэрпным, непрыхаваным болем за край і народ свой. Болем гэтым напоўнены радкі амаль кожнага твора, што былі змешчаны ў кнігах «Матчына душа», «Вячэрнія ветразі», «Мая Іліяда» і »Быў. Ёсць. Буду».

Вершы У. Караткевіча, пачынаючы з ранніх, першых – гэта нераўнадушныя, не чыста апісальныя творы. Кожны з іх напісаны на хвалі высокага эмацыянальнага напружання, у многіх нібы растварыліся кавалачкі найсумленнейшай паэтавай душы.

Паэзіі У. Караткевіча ўласцівая нейкая язычніцкая самаахвярнасць і адданасць жывому жыццю, першароднаму свету. Ён не аддзяляе сябе ад прыроды. Так, зліўшыся ў непадзельную цэласнасць, прага жыцця і самаахвярнасць нараджаюць гуманістычны светапогляд, гуманістычнае адчуванне таго, што ў табе самім і вакол цябе.

Нельга забыць і такіх аўтараў як І. Сіпакоў, В. Айзенштат, У. Казак, У. Корбан і іншыя.

Пры знаёмстве з байкай, адным з жанраў беларускай літаратуры, мэтазгодна звярнуцца да творчасці вядомага аршанскага байкапісца У.Корбана. Сатыра ў беларускай літаратуры – гэта самастойны жанр з уласнымі задачамі, сваімі выяўленчымі сродкамі. Асаблівай папулярнасцю карыстаецца ў народзе байка, у якой скандэнсаваны ўсе лепшыя здабыткі жывога народнага слова. Менавіты народны погляд на жыццёвыя з'явы, актыўнае стаўленне да народнага слова надалі доўгае жыццё байкам класіка беларускай літаратуры К.Крапівы. І гэтыя ж якасці прыцягнулі агульную ўвагу да лепшых баек У. Корбана, які з поўнай падставай лічыць сябе вучнем і паслядоўнікам К.Крапівы. У аўтабіяграфічных нататках «Ад разца да пяра» У. Корбан піша: «У Кандрата Кандратавіча я заўсёды вучыўся майстэрству сатырычнага твора, і ён па-бацькоўску прыклаў сваю вопытную руку да маёй першай кніжкі «Мы іх ведаем», якая выйшла ў 1950 годзе» [1, 345].

Літаратурная спадчына вядомага беларускага паэта ўражвае. За дваццаць год творчасці толькі ў Беларусі ўбачылі свет дзесяць зборнікаў паэзіі і прозы, а такія кнігі, як «Янка і санкі», «Пра жывёл і пра звяроў», «Учора, сёння і заўтра» і »Суседскі двор», напісаны спецыяльна для дзяцей.

Вядомы беларускі крытык Я.Казека, аналізуючы стан такога літаратурнага жанру, як байка, адзначае, што з імем Уладзіміра Корбана і »звязана сучасная беларуская байка». Адзначылі крытыкі і тое, што ў яго байках можна знайсці вобразы, якія па сваёй лаканічнасці, трапнасці і вобразнасці прэтэндавалі на ролю афарызма. Ф.Янкоўскі, шукаючы ў канцы 50-х гадоў крылатыя словы і афарызмы для сваёй кніжкі, з байкапісцаў спыніўся толькі на У.Корбане.

Сатырычныя вершы і байкі У.Корбана накіраваны супраць бюракратаў, хапуг, хуліганаў, хабарнікаў, паклёпнікаў, ашуканцаў. Не абмінала яго калючае слова кар'ерыстаў, эгаістаў, абывацеляў. Не цураецца У.Корбан і гумару, калі трэба гаварыць пра ўвогуле сумленных людзей, якім замінаюць пэўныя чалавечыя слабасці, дзівацтвы, не зусім добрыя звычкі – гэта байкі «Памочніца», «Ружа», «Струмень», «Ландышы і нарцысы». Сярод баек, напісаных У.Корбанам, нямала па-народнаму дасціпных і паэтычных твораў.

Байкам нашага земляка не адзін дзесятак год, але тыповасць гэтых твораў робіць іх сучаснымі і актуальнымі, бо тыя з'явы, якія «атручвалі» жыццё яго сучаснікам, характэрны і для нашых дзён.

Краязнаўчыя экскурсіі, экспедыцыі ў спалучэнні з літаратурнымі віктарынамі, вечарынамі, канферэнцыямі не толькі фарміруюць цікавасць навучэнцаў да літаратуры роднага краю, але і садзейнічаюць станаўленню пачуцця прыналежнасці да гісторыі і культуры, забяспечваюць пераемнасць духоўных традыцый [1, 14].

**Спіс літаратуры**


1. Корбан, У. Ад разца да пяра. Аўтабіяграфічны нарыс // Выбранае. – Мінск : Маст. літ., 1976.
2. Торханова, А. В. Художественное краеведение в воспитании школьников : пособие для педагогов / А. В. Торханова. – Минск : Беларусь, 2000. – 126 с.